*К. А. Шумскі,*
*кандыдат гістарычных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ ЭКАЛАГІЧНАЯ ЭТЫКА БЕЛАРУСАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сучасным этапе ў сувязі з вострым экалагічным крызісам, з якім сутыкнулася сусветная супольнасць, прыходзіць новае разуменне значэння шматвяковага вопыту ўзаемадзеяння чалавека і прыроды, назапашанага ў традыцыйнай культуры. Захаваныя народнай культурай прынцыпы адносін да навакольнага асяроддзя могуць дапамагчы знайсці спосабы вырашэння многіх экалагічных праблем сучаснасці.

У другой палове XX ст. на мяжы прыродазнаўчых (экалогія) і гуманітарных (этыка, этналогія) навук сфарміравалася новая міждысцыплінарная галіна комплексных даследаванняў – экалагічная этыка [1, с. 8–9]. У найбольш агульным плане экалагічная этыка – гэта сістэма маральных прынцыпаў і норм, што рэгулююць адносіны чалавека з прыродай. Яна заснавана на ўспрыняцці прыроды як маральнага партнёра (суб’екта), раўнапраўі і раўнацэннасці ўсяго жывога, добраахвотным імкненні чалавека да абмежавання сваіх патрэбнасцей.

У традыцыйных ведах і ўяўленнях беларусаў аб мясцовай флоры і фаўне, якія зафіксаваны ва ўсіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, адсутнічае абгрунтаванне драпежніцкіх адносін да расліннага і жывёльнага свету, адметныя павага да прыроды, яе прыгажосці, імкненне захоўваць і рацыянальна выкарыстоўваць прыродныя багацці. Гэта дае падставу сцвярджаць, што цягам многіх стагоддзяў сфарміравалася своеасаблівая традыцыйная экалагічная этыка, у якой утрымліваюцца маральныя нормы і прынцыпы паводзін нашых продкаў у адносінах да навакольнай прыроды.

Блізкасць сялян да прыроды, яе абагаўленне, прынцыпы роднасці, якія распаўсюджваліся на навакольны свет, нараджалі ўпэўненасць, што лёс чалавека і грамадства ў цэлым шмат у чым залежыць ад станоўчых ці адмоўных адносін да яго духаў прыроды. Беларускія сяляне ніколі не ссякалі дрэвы без патрэбы, бо лічылася, што дрэва павінна «памерці сваёй смерцю» [9, с. 134]. Адна з народных казак распавядае аб тым, як аднойчы селянін хацеў ссекчы ў лесе елку, а тая прасіла не кранаць яе,

абяцаючы сваю дапамогу; селянін спачатку так і зрабіў, але потым усё ж ссек дрэўца і адразу ж ператварыўся ў мядзведзя [6, с. 56]. Як бачым, асноўная ідэя сюжэта – гнеў пакрыўджанага дрэва. Паводле беларускіх павер'яў, у дрэвы часта перасяляліся чалавечыя душы: калі дрэва сякуць, то з яго ідзе кроў, чуваць стогны, а калі дрэва зарыпіць, то гэта прыкмета таго, што дрывасек вымушае душу шукаць сабе іншы прытулак [3, с. 57].

Шанаванне дрэў, як характэрная рыса славянскага язычніцтва, было своеасаблівым рытуалам маленняў, звернутых да вегетатыўнай сілы прыроды [5, с. 49]. Славяне мелі свяшчэнныя гаі, у якіх пакланяліся старым дрэвам (дубам, ясеням, клёнам, ліпам і інш) [9, с. 13, 135–136, 169–170]. Месцы, што напаміналі свяшчэнныя гаі («прошчы»), а таксама асобныя культавыя дрэвы захаваліся на тэрыторыі Беларусі як у XIX – пачатку XX ст., так і ў другой палове XX – пачатку XXI ст. [3, с. 58]. Гэта ўчасткі лесу з вельмі старых дрэў; часам яны абносіліся агароджай, у межах якой магла таксама знаходзіцца якая-небудзь святыня: капліца, крыж, абразы, крыніца, што лічылася лекавай. Сюды прыходзілі набіраць ваду, маліцца, тут адбываліся крыжовыя ходы ў царкоўныя святы, асабліва ў дні асвячэння мясцовых капліц. Культавыя дрэвы, якія згарэлі ці паваліліся ад старасці, пакідалі ў недатыкальнасці. За шкоду, якая наносілася такім дрэвам, чалавек караўся цяжкай хваробай – вар'яцтвам, слепатой, паралічом. Спроба кампенсаваць шкоду, напрыклад пасадзіць новае дрэва замест знішчанага, змякчала пакаранне, і хвароба магла «адпусціць» [9, с. 135].

Ссекчы любое дрэва, што расло паблізу хаты, на двары ці на вуліцы, для гаспадара дома ці тым больш іншага чалавека было вялікім грахом [7, с. 304]. Існавалі і іншыя забароны, звязаныя з дрэвамі. Так, нельга было знішчаць чаромху, «бо пчолам не будзе адкуль браць вясенні мёд» [7, с. 307]; рабіну: «хто зрэжа рабіну, той памрэ цяжкай смерцю» [10, s. 244]; а таксама ясень, бо «з яго нашыя продкі атрымалі свяшчэнны агонь» [7, с. 307].

Катэгарычна забаранялася без нагоды забіваць і нават крыўдзіць звяроў і птушак. Напрыклад, вялікім грахом лічылася забраць у вавёркі ўсе арэхі, знойдзеныя ў дупле: «гэта ўсё роўна, што адабраць хлеб у чалавека» [8, с. 49]. Грэшнай справай лічылася забойства салаўя, ластаўкі, голуба, жаваранка, сініцы, дзятла. Нельга было чапаць цецерука, «бо ён нікому не робіць зла» [7, с. 320; 11, s. 165]. Усе гэтыя ўяўленні грунтуюцца на этычных перакананнях, маральных прынцыпах, яны не ўтрымліваюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыслівай зацікаўленасці з боку чалавека; чалавек дзейнічае толькі ў інтарэсах прыроды, ахоўвае прыроду дзеля яе самой.

Шэраг прадстаўнікоў жывёльнага свету (у першую чаргу ластавак, жаваранкаў, буслоў, вужоў, пчол, мурашак) селянін лічыў свайго роду свяшчэннымі. На Палессі, перад тым як будаваць хлеў, прыносілі з лесу мурашак і высыпалі іх на абранае месца: «Калі мурашкі распаўзуцца, то нячыстае месца – там нічога не строй» [4, с. 18]. Такім жа чынам назіралі і за паводзінамі павука: калі прынесены павук пачынаў праз ноч «ткаць кросны» на новым месцы, яно лічылася прыдатным для будаўніцтва [11, s. 164].

Пчалу лічылі насякомым не толькі карысным, але і разумным, бо «куды яна не паляціць за мёдам, то не заблудзіць» [7, с. 311]. Даўней на Палессі існаваў сапраўдны культ пчол: «Наўмыснае забойства пчалы – гэта вельмі вялікі грэх; нават ненаўмысна забіць пчалу лічылася злачынствам… Хто заб'е пчаладзёра, той не толькі не саграшыць, але яшчэ атрымае ўзнагароду ў будучым жыцці, а злачынца будзе асуджаны на пакуты ў пекле» [7, с. 310].

Паводле думкі беларусаў, некаторыя жывёлы, а менавіта голуб і пчала, валодаюць «духам», гэта значыць душой, аднолькавай з душою чалавека, і, такім чынам, відавочна выдзяляюцца з ліку ўсіх іншых жывёл, таму пра іх нельга сказаць «здохлі», а трэба «памерлі» [11, s. 164]. Тут, зразумела, прасочваюцца перажыткі анімізму і хрысціянскія ўплывы (хрысціянства, як вядома, атаясамлівае Бога-Духа, трэці твар Троіцы, з галубкай), але ў шэрагу выпадкаў бачна і любоў да карысных і прыгожых прадстаўнікоў мясцовай фаўны.

Калі пад хатай паселіцца вуж, то такое суседства, па перакананні беларусаў, забяспечвае жыхарам дома здароўе і багацце, таму пра мёртвага вужа гаварылі «кончыўся» ці «памёр», але не «здох», каб вуж не пакараў за знявагу [6, с. 9, 14]. Лічылася, што той, хто ўбачыць вужа і не заб'е яго, будзе назаўсёды абаронены ад укусаў змяі. Этнографы канца XIX – пачатку XX ст. зафіксавалі звесткі аб тым, што на Палессі некалі трымалі вужоў у хатах пад печчу ці нават разам з дзецьмі [11, s. 164], а калі наступаў час карміць дзяцей, вуж смела выпаўзаў са свайго сховішча і еў разам з імі. Дзеці часам адпіхвалі яго, білі лыжкай па галаве, аднак вуж не крыўдзіўся і не кусаў іх. Для вужа спецыяльна ставілі ненакрыты збан малака, каб ён мог свабодна падсілкавацца. Калі вуж жыў у хляве, то яму дазвалялі частавацца малаком каровы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

непасрэдна з вымя. Вуж быў ахоўнікам гаспадаркі і як магічны сімвал, і непасрэдна як знішчальнік дробных грызуноў. А. В. Гура прыводзіць звесткі, што на Беларускім Палессі вужа і цяпер называюць «дамавіком», стараючца не крыўдзіць [2, с. 319].

Гэткай жа любоўю і пашанай карыстаўся і бусел, у якога, лічылася, быўператвораны чалавек, пакараны гэтак Богам.

…Бог даў чалавеку мех, куды паклаў усіх гадаў, і загадаў іх утапіць. Але чалавек быў цікаўным, развязаў мех, каб паглядзець, што ў ім, і, такім чынам, выпусціў усіх гадаў на волю. Тады Бог пакараў чалавека, ператварыўшы яго ў бусла і загадаўшы яму збіраць жаб і іншых гадаў [11, s. 165]. Кожны селянін жадаў мець на сваёй сядзібе буслінае гняздо, і нават на самой хаце, бо, згодна з народнымі вераваннямі, яно прыносіла шчасце. Меркавалася, што калі вясною бусел зробіць сваё гняздо на даху хаты ці паблізу яе, то хата на ўсё лета будзе абаронена ад маланкі і ўсялякага іншага ліха. Знішчэнне гнязда, а тым больш забойства бусла, лічылася вялікім злачынствам і грахом: сяляне верылі, што такога роду ўчынак можа наслаць смяротныя хваробы на дзяцей гэтага чалавека [7, с. 318–319].

Такім чынам, традыцыйная экалагічная этыка беларусаў мае ярка акрэслены экафільны характар. Адносіны з навакольным асяроддзем пабудаваны на прынцыпах дыялогу: прырода пры гэтым разглядаецца не толькі як аб’ект аднабаковага ўздзеяння і невычэрпная крыніца рэсурсаў, але і як суб’ект двухбаковага ўзаемадзеяння, яго паўнапраўны ўдзельнік. Акрамя гэтага, традыцыйная экалагічная этыка садзейнічае выхаванню такіх якасцей, як добразычлівасць, спагадлівасць, спачуванне і клапатлівасць у адносінах да прыроды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Борейко, В. Е.* Краткий курс экологической этики / В. Е. Борейко. – Киев : Киевский эколого-культурный центр, 2004. – 72 с.

2. *Гура, А. В.* Символика животных в славянской народной традиции / А. В. Гура. – М. : Индрик, 1997. – 912 с.

3. *Дучыц, Л. У.* Культавыя дрэвы ў Беларусі / Л. У. Дучыц // Studia mythologica slavica. – 2000. – N 3. – S. 57–62.

4. *Журавлев, А. Ф.* Домашний скот в поверьях и магии восточных славян : этнографические и этнолингвистические очерки / А. Ф. Журавлев. – М. : Индрик, 1994. – 256 с.

5. *Ненадавец, А. М.* Каму пакланяліся продкі / А. М. Ненадавец. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 239 с.

6. *Нікольскі, М. М.* Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераньнях беларускага сялянства / М.М. Нікольскі. – Менск : Изд-во АН БССР, 1933. – 136 с.

7. *Пяткевіч, Ч.* Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 672 с.

8. *Сержпутоўскі, А. К.* Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

9. *Славянская* мифология : энцикл. словарь / редкол. : С. М. Толстая [и др.]. – 2-е изд. – М. : Междунар. отношения, 2002. – 512 с.

10. *Federowski, M.* Lud Bjaloruski na Rusi Litewskiej : materjaly do etnografii slowjanskjei zgromagzone w latach 1877–1891 / M. Federowski. – Krakow : Wydawnictwo komisii antropologicznej Akademii Umiejetnosci, 1897. – Tom 1 : Wjara, wierzenja i przsady ludu z okolic Wolkowyska, Slonima, Lidy i Sokolki. – 534 s.

11. *Moszyński, K.* Polesie Wschodnie : Materjaly etnograficzne z wschodniej cześći b. powiatu Mozyrskjego oraz z powiatu Rzcezyckjego / K. Moszyński. – Warszawa : Wydawnictwo im. Mianowskiego, 1928. – 381 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ